# Педагогіка, псіхалогія

М. С. МЯЦЕЛЬСКІ

## НАРОДНАЕ НАСТАЎНІЦТВА БЕЛАРУСІ Ў ПЕРЫЯД РЭВАЛЮЦЫІ 1905—1907 ГАДОЎ

Цесна звязаныя з народам сваім паходжаннем і сацыяльным становішчам перадавыя народныя настаўнікі Беларусі ўспрынялі рэвалюцыю 1905—1907 гадоў з энтузіязмам і самі сталі яе актыўнымі ўдзельнікамі. Як паведамлялі мясцовыя ўлады, настаўнікі распаўсюджвалі ў народзе нелегальную літаратуру, аказвалі «шкодны ўплыў на навакольнае цёмнае сялянскае насельніцтва». За «падбухторванне да хваляванняў», «супрацьурадавыя дзеянні» у Гродзенскай губерні было зняволена 13 настаўнікаў, у беларускіх паветах Віленскай і Ковенскай губерняў—27, у Мінскай губерні—4, у тым ліку і Я. Колас (Канстанцін Міцкевіч). Сотні настаўнікаў былі звольнены, пераведзены ў іншыя паветы[1].

Шмат настаўнікаў было звязана з сацыял-дэмакратычнымі арганізацыямі, дзейнічала пад іх кіраўніцтвам, выконвала іх заданні. Зразумела, яны былі прыхільнікамі ідэй партыі і ў галіне народнай асветы, звязвалі дэмакратызацыю школьнай справы з перамогай рэвалюцыі. Так, нелегальны з'езд народных настаўнікаў, які адбыўся 9 ліпеня 1906 года, заявіў: «Паколькі сапраўды дэмакратычную перабудову школьнай справы немагчыма ажыццявіць ва ўмовах сучаснага ладу, група (з'езд—М. М.) бліжэйшай сваёй мэтай паставіла актыўна імкнуцца да звяржэння яго шляхам непасрэднага ўплыву на сялян, арганізацыі іх»[2]. Гэтага погляду прытрымлівалася і нелегальнае «Часовае бюро Мінскай групы настаўнікаў», якое было створана для правядзення падрыхтоўчай работы па скліканню ў канцы 1906 года з'езда настаўнікаў Мінскай губерні. У звароце «Да ўсіх настаўнікаў і настаўніц народных, царкоўнапрыходскіх і іншых вучылішч» бюро заклікала іх да згуртавання, бо толькі аб'яднанае настаўніцтва можа стаць тою сілаю, з якой «будуць лічыцца нашы ворагі і ворагі нашай справы»[3].

Патрабаванні перадавой часткі народнага настаўніцтва па перабудове школьнай справы выказаны ў шэрагу дакументаў. Найбольш важнымі з іх з'яўляюцца матэрыялы аб нелегальных з'ездах народных настаўнікаў. У студзені 1906 года па ініцыятыве настаўніцы А. Палітаевай адбыўся з'езд настаўнікаў беларускіх валасцей Свяцянскага павету Віленскай губерні, які абмеркаваў «матэрыяльнае і прававое становішча народнага настаўніка, адносіны яго да вясковага насельніцтва, стан вучэбна-выхаваўчай справы ў настаўніцкай семінарыі і ў народнай школе». У сувязі з абмежаванасцю колькасці ўдзельнікаў сход не лічыў сябе выразнікам агульнай думкі настаўнікаў ніжэйшай школы, а таму не прыняў ніякіх рэзалюцый, акрамя агульных пажаданняў паляпшэння становішча школы і настаўніка.

Праведзены 25 мая 1907 года ў Вільні з'езд абвясціў аб стварэнні Беларускага настаўніцкага саюзу і прапанаваў у якасці яго задач «1) перабудову справы народнай асветы на шырокіх свабодных дэмакратычных асновах для карысці народа, каб узняць яго грамадзянскую самасвядомасць; 2) уводзіць у школе навучанне на роднай мове; 3) дабівацца незалежнасці школы і настаўніка ад рознага начальства, а для гэ-

тага выбіраць свае камітэты, якія і павінны сачыць за працай настаўніка ў школе»[4].

Рабіліся спробы правесці з'езды народных настаўнікаў ва ўсіх губернях Беларусі. У Магілёўскай губерні ў кастрычніку 1905 года спрабавала склікаць з'езд праўленне таварыства ўзаемадапамогі настаўнікам. На з'езд выносіліся пытанні аб стварэнні саюзу настаўнікаў пачатковай школы, аб яго праграме і мэтах, а таксама «аб садзейнічанні настаўнікаў свядомым адносінам насельніцтва ў маючых адбыцца выбарах у Дзяржаўную думу». Дырэктар народных вучылішчаў губерні забараніў настаўнікам з'яўляцца і на гэты, і на іншыя з'езды, «калі яны склікаюцца без згоды кіраўнікоў народна-вучэбнай справы ў губерні для мэт, пабочных гэтай справе»[5]. Ён, відаць, баяўся, што з'езд можа ператварыцца ў трыбуну для выкрыцця палітыкі самадзяржаўя ў справе народнай асветы і (што было асабліва небяспечна) у трыбуну прапаганды бальшавіцкага байкоту выбараў у думу.

У Гродзенскай губерні ў лістападзе 1905 года былі праведзены павятовыя сходы з мэтай падрыхтаваць і правесці ў снежні агульны губернскі з'езд, на які выносіліся пытанні аб павелічэнні зарплаты народным настаўнікам, аб пенсіях, пераўтварэнні аднакласных школ у двухкласныя з чатырохгадовым навучаннем. Дырэктар народных вучылішчаў прасіў папячыцеля Віленскай вучэбнай акругі дазволіць з'езд, бо ў выпадку яго правядзення без удзелу начальства «кіруючую ролю... возьмуць на сябе прадстаўнікі крайніх палітычных партый»[6]. Але дазволу папячыцель не даў.

Мінскі дырэктар народных вучылішчаў 27 снежня 1905 года прасіў губернатара не дапусціць правядзення з'езда настаўнікаў пачатковых школ Мінскага павета, удзельнікам якога ўжо былі разасланы запрашэнні. Аб арганізатарах і парадку дня з'езда ў перапісцы паміж дырэктарам і губернатарам нічога не гаварыцца. Дырэктар толькі пісаў, што лічыць з'езд «вельмі непажаданым і шкодным па сваіх выніках». Паліцыя не дапусціла правядзення назначанага на 23 снежня 1905 з'езда настаўнікаў Мінскага павета, ініцыятарам якога «быў Сабалеўскі — адзін з паслядоўных прыхільнікаў сацыял-дэмакратыі».

Мікалаеўшчынскі з'езд, адным з арганізатараў якога быў Я. Колас, растлумачыў у звароце «Таварышы настаўнікі», што галоўнай мэтай народнага настаўніцтва з'яўляецца барацьба за звяржэнне самадзяржаўя, адклаў выпрацоўку праграмы канкрэтнай перабудовы школьнай справы да наступнага з'езду[7].

Часовае бюро Мінскай групы настаўнікаў у сваім «Звароце» абвясціла аб далучэнні да статута Усерасійскага настаўніцкага саюзу і аб скліканні ў час паміж 25 снежня 1906 года — 6 студзеня 1907 года з'езду настаўнікаў Мінскай губерні і прапанавала мясцовым групам абмеркаваць «усе пытанні, што ўзнікаюць у настаўнікаў і цікавяць іх, і патрэбы як усяго настаўніцтва, так і свае мясцовыя, а таксама шляхі паляпшэння становішча школы і настаўніка», прыбыць на з'езд з выпрацаванымі на месцах рэзалюцыямі па гэтых пытаннях[8].

Удзельнікі праведзеных і арганізатары не дазволеных уладамі з'ездаў, як відаць з указаных дакументаў, змагаліся за вырашэнне дзвюх вострых праблем: паляпшэння становішча настаўнікаў і перабудовы школы. Адносіны ўсяго народнага настаўніцтва да стану пачатковай адукацыі выразна адлюстравала Часовае бюро Мінскай групы настаўнікаў: «Хто не ведае сумнага становішча нашай пачатковай школы?» На наш погляд, у паняцце «сумнае становішча» бюро ўключала ўсе вынікі ўрадавага «клопату» аб пачатковай школе: жахлівую беднасць яе матэрыяльнай базы, недапушчальную малалікасць школьнай сеткі, перакладванне расходаў па ўтрыманню школ на насельніцтва, адсутнасць сувязі са школамі вышэйшых разрадаў і г. д. Аднак з'езды не лічылі сябе дастаткова прадстаўнічымі, каб выступаць з праграмай пераўтварэнняў ад імя ўсяго настаўніцтва. Таму Мікалаеўшчынскі з'езд адклаў выпрацоўку канкрэтных патрабаванняў да наступнага, больш прадстаўнічага. Часовае бюро планавала правесці на месцах па ўсіх пытаннях пачатковай адукацыі шырокія папярэднія абмеркаванні, якія дадуць магчымасць усяму настаўніцтву ўдзельнічаць у выпрацоўцы патрабаванняў на з'ездзе.

Аб поглядах народных настаўнікаў на пытанні перабудовы школы сведчаць і шматлікія іх выступленні ў друку ў большасці (па меркаваннях бяспекі) ананімныя. Так, газета «Витебские губернские ведомости» на працягу 1905—1907 гадоў на сваіх старонках змясціла шэраг пісем аб

«абураючай беднасці» настаўнікаў і самавольстве «мясцовых заправіл» у адносінах да іх, што выклікае ўцёкі апошніх са школ, «паралізуе справу пачатковай народнай адукацыі»; аб поўнай непрыгоднасці школьных будынкаў, нястачы падручнікаў, пісьмовых прылад і іншых вучэбных дапаможнікаў для работы з вучнямі, у выніку чаго ў навучанні немагчымы ніякія сучасныя дыдактычныя метады; аб вострай нястачы і такіх школ (адна царкоўнапрыходская школа на воласць); аб неадкладнай патрэбе павышэння «узроўню разумовага развіцця народа» шляхам ажыццяўлення ўсеагульнага навучання і фактычным процідзеянні ўрада яму. «На ўсё ў Расіі хапае сродкаў,—пісаў адзін з ананімных карэспандэнтаў-настаўнікаў,—але толькі не на народную асвету, не на падрыхтоўку настаўнікаў»[9]. Аб беднасці народных настаўнікаў, неабходнасці павелічэння ім зарплаты і вызвалення іх ад зняважлівых сялянскіх «ссыпак» публікавалі матэрыялы «Гродненские губернские ведомости», «Северо-Западный край», «Наша доля», «Наша ніва» і іншыя перыядычныя выданні. Характэрным у гэтых адносінах з'яўляецца артыкул у часопісе «Народное образование в Виленском учебном округе». Настаўнік пісаў: «Поўная занядбанасць, паўжабрацкае, паўгалоднае існаванне. Спёртае паветра ў выніку цеснаты школьных памяшканняў, шматлікасць вучняў, халодныя і сырыя кватэры. Цяжкае грамадскае і прававое становішча, калі ўсякі можа насварыцца на настаўніка,.. узвесці на яго ўсялякія абвінавачанні. Умовы цяжкай, непасільнай працы, якая выціскае з яго ўсе сокі, усе сілы, расхіствае нервовую сістэму... Адсюль зразумела, чаму многія настаўнікі так часта хварэюць. Знясіленне, малакроўе, сухоты, нервовае парушэнне, вочныя і іншыя хваробы з'яўляюцца неадлучным спадарожнікам настаўніка»[10].

Перадавая частка народнага настаўніцтва ўдзельнічала ў рэвалюцыйным руху, змагалася за перабудову школьнай справы і пасля рэвалюцыі 1905—1907 гадоў, нягледзячы на ўзмацненне ганенняў і рэпрэсій. Напрыклад, за рэвалюцыйную работу сярод сялян у кастрычніку 1908 года праследаваліся настаўнікі Бабыніцкага і Коханаўскага народных вучылішчаў А. Кістмач і Н. Гоман. На працягу 1908—1911 гадоў перадавыя настаўнікі спрабавалі арганізоўваць свае выданні з мэтай кансалідацыі настаўніцкіх сіл. Так, у сакавіку 1908 года выйшаў у свет зборнік групы настаўнікаў Віцебскай губерні «Голос учителя», у 1909—зборнік «Белорусский учитель», за 1910—1911 гады—некалькі нумароў часопіса народных настаўнікаў Магілёўшчыны «Белорусский учительский вестник».

Названыя выданні рэзка асуджалі афіцыйную палітыку ў народнай асвеце, у выніку якой 75% дзяцей школьнага ўзросту «застаецца непісьменнымі... З прынятых у школу дзяцей заканчвае яе толькі 10—15%. Але і гэтыя 10—15% не адукоўваюцца, а адурманьваюцца бессэнсавай зуброжкай, рэжымам муштры і прыгнёту. На уроках імкнуцца выхоўваць у дзяцей пачуцці рэлігійнага і нацыянальнага антаганізму... Артыкулы (падручнікаў па чытанню—М. М.)... састаўлены вельмі тэндэнцыйна і так скажаюць сутнасць рэчаў, што карыстацца імі ў навучанні—гэта значыць несці народу путы, каб аблытаць думкі і ўкараняць у розум дзяцей павагу да таго, што стагоддзямі прыгнятала іх продкаў і падтрымлівала цемнату»[11].

Часопісы абвінавачвалі ўрад за цяжкія ўмовы жыцця народнага настаўніка, за сістэму зняважлівага нагляду за ім, поўную яго безабароннасць перад самавольствам адміністрацыйных і вучэбных улад. У рэдакцыйных артыкулах выказваліся і пагляды іх арганізатараў на пытанні перабудовы школ. Галоўнай мэтай яны ставілі «увядзенне ўсеагульнага навучання і карэнную перабудову пачатковай школы». «Неабходна,—заклікаў часопіс «Голос учителя»,—устанавіць адзіны тып школы, школы свабоднай, свецкай, падведамаснай органам грамадскага самакіравання»[12]. «Белорусский учитель» і «Голос учителя» лічылі, што рашаючай сілай у барацьбе за свабодную школу з'яўляецца народ. І няма больш важнай задачы ў настаўніка, чым асветніцкая работа сярод народа, абуджэнне яго класавай свядомасці. Настаўнік «выканаў свой абавязак, растлумачваючы народу сапраўдны сэнс тагачасных падзей». Ва ўмовах, калі «набыткі народнага руху гэтых гадоў адно за другім аднімаюцца», настаўнік абавязаны дапамагчы народу аб'яднацца, усвядоміць сваю сілу, вызваліцца ад «векавечнай глухаты і слепаты»[13]. Усе гэтыя выданні былі закрыты ў сувязі з іх антыўрадавай пазіцыяй.

Разгледжаныя матэрыялы сведчаць, што перадавое настаўніцтва Бе-



14

ларусі ў гады першай рускай рэвалюцыі актыўна ўдзельнічала ў барацьбе за перабудову школьнай справы ў інтарэсах народных мас. Той факт, што яно абмяжоўвала сваю дзейнасць толькі праблемамі пачатковай школы, не зніжае важнасці яго ўкладу ў гэтую барацьбу. Пачатковая школа ў той час фактычна была адзінай даступнай працоўным школай, і вырашэнне яе праблем мела першараднае значэнне для пашырэння асветы ў народзе.

[1] ЦГДА Літ. ССР, ф. 567, воп. 12, спр. 7597, л. 4—6, 12, 58, 99—100, 151; ЦГДА БССР, ф. 458, воп. 1, спр. 235, л. 69—70.
[2] ЦГДА БССР, ф. 458, воп. 1, спр. 342, л. 40—68.
[3] ЦГДА Літ. ССР, ф. 567, воп. 12, спр. 10361; л. 2.
[4] Из истории школы Белоруссии и Литвы.— М., 1964, с. 148.
[5] ЦГДА БССР, ф. 2254, воп. 2, спр. 406, л. 51—52.
[6] ЦГДА Літ. ССР, ф. 567, воп. 29, спр. 161, л. 1—2.
[7] ЦГДА БССР, ф. 458, воп. 1, л. 48—60.
[8] ЦГДА Літ. ССР, ф. 567, воп. 12, спр. 10361, л. 2.
[9] ЦГДА БССР, ф. 1416, воп. 6, спр. 759, л. 426—429; спр. 775, л. 304—308; спр. 849, л. 143—146; спр. 882, л. 886—889.
[10] Народное образование в Виленском учебном округе.— Вильно, 1907, № 7—8, с. 277.
[11] Белорусский учительский вестник.— Могилев, 1910, № 4, с. 6; Голос учителя.— Витебск, 1908, сб. 1, с. 18—19.
[12] Голос учителя, с. 3—5.
[13] Белорусский учитель.— СПб., 1909, с. 6; Голос учителя, с. 4, 8, 10—13.

ГАЛЕБ АЛЬ-ТАМИМИ

# МЕСТО ТЕРМИНОЛОГИИ В ОБУЧЕНИИ АРАБОВ РУССКОМУ ЯЗЫКУ

Неуклонно ускоряющийся научно-технический прогресс влечет за собой рост потока информации. Усиление международных контактов и непрерывно расширяющийся обмен информацией приводит к лексическому взаимодействию языков, поэтому увеличение количества терминов в одном из них не может проходить изолированно от других. В последнее время заметно активизировалось воздействие русской научно-технической терминологии на терминологию других языков. Знание русской терминологии и языка «открывает доступ к 75—80% информации, существующей в мире» [1].

Возрастающий интерес к русской художественной и научной литературе, интерес к Советской стране в целом, большой авторитет ее на международной арене вызывает желание у миллионов людей разных стран овладеть русским языком. Так, в Багдадском университете (Ирак) широко развернута работа по совершенствованию методики преподавания русского языка и усвоения его терминологии. Данная статья содержит некоторые рекомендации, касающиеся усвоения русской терминологии арабской аудиторией.

Русский язык, как правило, с трудом усваивается арабами. Поэтому, чтобы иметь положительный эффект в преподавании его, необходимо прежде всего объединить учащихся в соответствии с избранной ими профессией, а затем каждое из таких объединений разделить на небольшие группы, примерно по 10—15 человек. Это позволит провести четкий и обоснованный отбор терминов, являющихся наиболее ценными и обязательными для усвоения обучающимися той или иной группы.

Для более эффективного обучения русскому языку предлагается использовать отрывки художественного текста, содержащего необходимые термины. Это будет способствовать более быстрому усвоению учащимися не только общеупотребительной лексики, но и терминов. Вместе с тем это повысит уровень языковой подготовки учащихся, познакомит их с современной художественной литературой, а через нее с жизнью, работой, с лучшими чертами советских людей: целеустремленностью, трудолюбием, внутренним благородством и т. д. Одновременно эти отрывки могут использоваться и на занятиях по грамматике. Использование их даст преподавателю возможность активизировать в речи учащихся рус-